Кантрольная работа
Дзесятковыя дробы
Варыянт 1

1. Укажыце заданне, у якім параўнанне лікаў выканана правільна:

а) $12,3 < 9,8$;

б) $100,0099 < 100,01$.

2. Акругліце лік 5,8736 да тысячных.

3. Устанавіце парадак выканання дзеянняў і знайдзіце значэнне лікавага выразу:

$$\frac{4\frac{2}{7} \cdot 1\frac{3}{4} - 3,36}{0,8 + 1,5}.$$

4. За 0,7 кг каўбасы і 1,8 кг сыра заплацілі 24,82 рубля. Колькі каштуе 1 кг каўбасы, калі 1 кг сыра каштуе 10,6 рубля?

5. У магазін прывезлі смартфоны новай мадэлі. У першы дзень прадалі 0,5 усіх смартфонаў, а ў другі – 0,6 астачы. Пасля гэтага ў магазіне засталося 16 смартфонаў. Колькі смартфонаў прывезлі ў магазін першапачаткова?

LIVEWORKSHEETS

Кантрольная работа
Дзесятковыя дробы
Варыянт 2

1. Укажыце заданне, у якім параўнанне лікаў выканана правільна:

а) $6,9 > 11,6$;

б) $80,0088 < 80,01$.

2. Акругліце лік 8,7528 да тысячных.

3. Устанавіце парадак выканання дзеянняў і знайдзіце значэнне лікавага выразу:

$$\frac{2,48 + 3\frac{5}{9} \cdot 1\frac{1}{8}}{6,1 - 3,7}.$$

4. За 2,1 кг мяснога фарша і 0,9 кг каўбасы заплацілі 25,62 рубля. Колькі каштуе 1 кг каўбасы, калі 1 кг фарша каштуе 6,8 рубля?

5. У школьнай сталовай прыгатавалі піцу. На першым перапынку навучэнцы купілі 0,5 усіх піц, а на другім – 0,4 піц, якія засталіся. Пасля гэтага ў сталовай засталося 12 піц. Колькі піц прыгатавалі ў сталовай першапачаткова?

LIVEWORKSHEETS

Кантрольная работа
Дзесятковыя дробы
Падрыхтоўчы варыянт

1. Укажыце заданне, у якім параўнанне лікаў выканана правільна:

а) 5,3 > 10,1;

б) 40,0044 < 40,01.

2. Акругліце лік 5,2367 да тысячных.

3. Устанавіце парадак выканання дзеянняў і знайдзіце значэнне лікавага выразу:

$$\frac{1\frac{3}{5} \cdot 3\frac{1}{8} + 2{,}35}{7{,}2 - 4{,}7}$$

4. За 2,3 кг бананаў і 0,8 кг апельсінаў заплацілі 16,16 рубля. Колькі каштуе 1 кг апельсінаў, калі 1 кг бананаў 4,8 рубля?

5. Ад скрутку праваду адрэзалі 0,5, а потым яшчэ 0,2 астачы. Пасля гэтага засталося 60 м праваду. Колькі метраў праваду было ў скрутку?

LIVEWORKSHEETS